Репозиторий ВГУ

**Марцынкевіч І.А.**

## АДМЕТНАСЦІ САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ДЭМАБІЛІЗАВАНЫХ І ІНВАЛІДАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ПАСЛЯВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Заканчэнне Вялікай Айчынай вайны прынесла не толькі радасць перамогі, але і новыя цяжкасці, звязаны з пасляваенным аднаўленнем народнай гаспадаркі БССР. Наладзіць у такіх умовах дзейсную сістэму сацыяльнага забеспячэння франтавікоў было складана. Галоўнай умовай пабудовы дзейснай сістэмы дапамогі інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны стала стварэнне цэнтралізаванай прамыслова-тэхнічнай і калгасна-саўгаснай базы, праз якія, аказвалася сацыяльная дапамога інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 131]. Ва ўсходняй Беларусі такая база была ўтворана яшчэ ў 30-я гг. На тэрыторыі Заходняй Беларусі без правядзення індустрыялізацыі і калектывізацыі стварыць падобную мадэль сацыяльнай дапамогі, якая існавала ў БССР, было немагчыма. Рэалізацыя гэтай мэты ўскладнялася антыбальшавіцкай настроенасцю мясцовага насельніцтва, супраціўленнем савецкай уладзе.

Наяўнасць такога негатыўнага стаўлення вылівалася ў пэўную дыскрымінацыю кіраўнікамі бальшавіцкай сістэмы заходніх абласцей Беларускай ССР у працэсе пасляваеннага аднаўлення і развіцця гаспадаркі. Мэтай дыскрымінацыі з’яўлялася пакаранне насельніцтва гэтай часткі рэспублікі за менш актыўны ўдзел у параўнанні з усходнімі абласцямі ў партызанкім руху. Да таго ж адносіны да савецкай улады з боку мясцовага насельніцтва яшчэ больш абвастрыліся пасля правядзенння на далучаных тэрыторыях Заходняй Беларусі дэпартацыі “недобранадзейнага” насельніцтва. Нават партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі Беларускай ССР ў пачатку 50-х гадоў былі вымушаны канстатаваць, што развіццё заходніх абласцей значна адставала ад усходніх. Зразумела, што такога роду дысбаланс негатыўна адбіваўся на забяспечаннасці дэмабілізаваных і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 229–230].

Да таго ж сітуацыю ўскладняла маруднае аднаўленне сельскай гаспадаркі. Вытворчыя сілы вёскі былі вычарпаны, і на гэтым фоне пасляваенная разруха адчувалася найбольш моцна. Фінансавыя сродкі, якія накіроўваліся на аднаўленне сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі выдзяляліся ў меншых памерах. Распачатая калектывізацыя, якая часта праводзілася прымусовымі адміністратыўна-каманднымі метадамі, значна зацягнулася. Сур’ёзнай перашкодай з’яўлялася вялікая колькасць сельскіх хутарскіх гаспадарак [1, с. 131]. Марудна ажыццяўляемыя ў заходнебеларускай вёсцы пераўтварэнні калгасна-саўгаснай сістэмы ўскладнялі наладжванне ў сельскай

мясцовасці сістэмы дапамогі былым франтавікам, якая больш-менш эфктыўна ўжо працавала ва Усходняй Беларусі. Адной з асноўных крыніц дапамогі дэмабілізаваным франтавікам з'яўляліся касы калгаснай узаемадапамогі. Аднак у заходніх абласцях калгасная сістэма і існуючыя пры ёй касы адсутнічалі. У выніку дзейсную дапамогу з гэтай крыніцы дэмабілізаваныя вяскоўцы маглі атрымаць толькі пасля абагульнення прыватных гаспадарак.

Сумным вынікам надзвычай цяжкага становішча ў сельскай гаспадарцы БССР і бядотнага жыцця ў беларускай вёсцы ў пасляваенны час з'явілася імкненне значнай колькасці яе жыхароў перасяліцца ў Польшчу згодна з адпаведнымі дзяржаўнымі пагадненнямі. Па стане на 15 чэрвеня 1945 г. з рэспублікі ў суседнюю краіну выказвалі жаданне выехаць 96 129 гаспадарак, якія мелі ў сваім складзе 320 414 чалавек [4, с. 231].

Забяспечанасць жыллём у заходніх рэгіёнах Беларускай ССР заставалася цяжкім. Прыватныя дамы і гаспадарчыя пабудовы, пакінутыя беларусамі пры эміграцыі ў Польшчу, маглі стаць важным сродкам ў справе забеспячэння франтавікоў жыллём. Аднак перадача ім дамоў нярэдка праходзіла з парушэннямі. Нягледзячы на тое, што па заканадаўстве першачаргова жыллём павінны былі забяспечвацца інваліды Вялікай Айчыннай вайны, на месцах справа не заўсёды вырашалася на іх карысць. Ва ўмовах узрослай пасля вайны каштоўнасці жылля даволі частымі былі выпадкі, калі пасля ад'езду былых гаспадароў за межы БССР, вызваленая жылплошча размяркоўвалася не сярод інвалідаў вайны, а выкарыстоўвалася ў іншых мэтах або размяркоўвалася паміж прадстаўнікамі ўлады ці іх родзічамі. Так, ў 1946 г. з Маладзечанскага раёна выехала 109 польскіх гаспадарак, але кіраўніцтвам раёна не было прынята своечасовых мер па размеркаванні вызваленых будынкаў. У выніку многія інваліды Вялікай Айчыннай вайны не маглі дабіцца права на атрыманне гэтых памяшканняў. Хадайніцтвы ад іх, якія адрасоўваліся райвыканкамам, па некалькі разоў вярталіся ў сельскія саветы, а самі дамы, аб якіх яны хадайнічалі, прадаваліся іншым асобам.

У сакавіку 1947 г. маці дэмабілізаванага М.М. Барташэвіча з в. Мароські звярнулася да старшыні Мароськаўскага сельскага савета з просьбай аб продажы ёй хлева з дзяржфонду будынкаў, паколькі на той момант жанчына вымушана была жыць у зямлянцы. Але ёй было адмоўлена без усялякага тлумачэння прычын [5, арк. 11–12].

Інвалід ІІ-й групы І.М. Гамока з в. Рыеўшчына Раеўскага сельсавета Маладзечанскага раёна не мог самастойна перамяшчацца па прычыне ранення. З 1946 па 1947 гг. яго жонка падала дзве заявы на імя старшыні сельскага савета Е.В. Фурманава і адну заяву ў выканкам Маладзечанскага райсавета з просьбай аб продажы або бясплатным выдзяленні дома ці якой-небудзь халоднай будыніны для будаўніцтва. Хата, якую меў І.М. Гамока да вайны, была спалена немцамі, і сам інвалід вымушаны быў жыць на падсяленні ў кватэры. На тэрыторыі сельсавета было два дома братоў Ляшчынскіх, якія выехалі на той час ў з в. Вялікія Кажэўнікі ў Польшчу. Побач з жылымі дамамі меліся і будынкі, якія можна было перабудаваць пад жылыя. Аднак у іх прадастаўленні таксама было адмоўлена. Тады сям'я І.М. Гамокі звярнуліся з просьбай прадаць дом з Хоцімскага сельскага савета. Аднак і гэта просьба засталася без задавальнення. Тлумачылася гэта тым, што з іншых сельсаветаў дамы не прадаюцца. Аднак пазней усе будынкі, пра якія узгадвалася ў прашэннях і хадайніцтвах сям'і інваліда І.М. Гамокі, былі прададзены невядомым арганізацыям і вывезены ў Маладзечна. У выніку інвалід вайны ІІ-й групы за ўвесь гэты час не змог забяспечыць сябе гатовым жыллём і вымушаны быў будаваць яго. Па гэтай прычыне ён павінен быў ездзіць на нарыхтоўку лесу за 20 км, не маючы пры гэтым нікога з працаздольных памагатых [5, арк. 97].

Выдзяленне зямельных надзелаў пад будаўніцтва было адным з распаўсюджаных спосабаў забеспячэння дэмабілізаваных франтавікоў жыллём. Але і тут не абыходзілася без пэўных хібаў. Паколькі раздача зямельных участкаў ішла паралельна з праводзімай у Заходняй Беларусі калектывізацыяй, то, зразумела, што лепшыя землі адыходзілі ў калгас.

Сама арганізацыя выканання даручэнняў і кантролю за забеспячэннем інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны была наладжана слаба. Да прыкладу, у 1946 г. – першым квартале 1947 г. Маладзечанскі райсабес не ўлічваў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія мелі патрэбу ў набыцці малочнай жывёлы, і дапамогі ў гэтым не аказвалі. Сельскагаспадарчы аддзел Маладзечанскага выканкама райсавета і яго загадчык С.А. Кісялёў не займаліся пытаннямі надзялення дэмабілізаваных франтавікоў зямельнымі надзеламі, агародамі і



Рэпазіторый БрДУ

сенакосамі з фондавых зямель, якія былі абрэзаныя ў заможных сялян і той часткі сялян, якія выехалі ў Польшу [5, арк. 13].

Каб нейкім чынам паўплываць на сітуацыю, разгляд зямельных пытанняў быў перададзены сельскім саветам. Аднак абыякавасць да патрэб інвалідаў і злоўжыванне службовым становішчам былі і тут. Так жыхар в. Хахлова, інвалід Вялікай Айчыннай вайны, Г.А. Шпілеўскі не меў зямлі і звярнуўся ў 1947 годзе да старшыні Хахлоўскага сельскага савета Зазерскага з просьбай аб выдачы яму участка для сенакоса і агарода. Зазерскі адмовіў інваліду вайны ў прадастаўленні зямельнага надзелу каля дома, а адвёў зямлю і агарод за паўтара кіламетра ад дома. Частку таго надзела, што прымыкаў да дома Шпілеўскага, забраў сабе, астатняе раздаў блізкім яму людзям і дырэктару школы [5, арк. 14].

Інвалід Вялікай Айчыннай вайны Н.І. Нарыновіч з в. Хахлова таго ж сельскага савета ў 1937 годзе як беззямельны быў надзелены ворнай зямлёй. У 1941 г. ён быў прызваны ў Чырвоную Армію, ваяваў на фронце і паранены вярнуўся дадому ў 1946 г. Падчас знаходжання Н.І. Нарыновіча на лячэнні ў шпіталі яго зямля была раздадзена іншым сялянам. На просьбу інваліда аб выдачы надзела зямлі і агарода старшыня сельсавета Зазерскі прапанаваў участак за 5 км. ад хаты. Не маючы каня, Н.І. Нарыновіч вымушаны быў адмовіцца ад гэтага надзела і папрасіў выдзеліць яму 0,39 га зямлі пад агарод бліжэй. Але Зазерскі не задаволіў прашэнне, а надзел, які мог узяць франтавік, засеяў для сябе пшаніцай.

Такіх прыкладаў несправядлівага размеркавання маёмасці і матэрыяльных сродкаў сустракалася даволі шмат. Злоўжываннне з боку прадстаўнікоў мясцовых улад і абыякавыя адносіны да інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны былі даволі частай з’явай у пасляваеннай Заходняй Беларусі. Гэта пацвярджаецца асноўным зместам скаргаў і хадайніцтваў гэтага перыяду, якія паступалі ў вышэйшыя інстанцыі і кантралюючыя органы ад дэмабілізаваных франтавікоў. У пераважнай большасці з іх утрымліваліся звароты аб няправільным падзеле зямлі, таксама аб выдзяленні аднаразовай грашовай дапамогі, размеркаванні вопраткі і прадуктаў харчавання [5, арк. 15].

Нярэдка паскоранае абагульненне аднаасобных гаспадарак у Заходняй Бедарусі ў канцы 40-х – пач. 50-х гг. адбывалася з прымяненнем рэпрэсіўных мер і выклікала незадаволенасць сярод мясцовага насельніцтва, але яно несла і станоўчыя моманты. З другой паловы 40-х гадоў узмацніліся працэсы другой хвалі калектывізацыі, завяршэнне якой стварыла ў заходніх рэгіёнах краіны перадумовы для ўзнікнення першых кас узаемадапамогі. Паколькі яны адыгрывалі важную ролю ў забеспячэнні былых франтавікоў, то Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР распараджэннем ад 25 сакавіка 1950 г. загадала ўсім абласным і раённым аддзелам сацыяльнага забеспячэння БССР больш актыўна праводзіць арганізацыю кас грамадскай узаемадапамогі калгаснікаў.

Па меры таго як у Заходніх рэгіёнах БССР праводзілася работа па ўзбуйненні калгасаў, аблсабесам і райсабесам прадпісвалася арганізоўваць сваю працу такім чынам, каб пры ўзбуйненні калгасаў адначасова праводзіць і зліццё кас грамадскай узаемадапамогі калгаснікаў з адначасовым аб’яднаннем і матэрыяльных фондаў кас.

Разам з тым у калгасах, дзе касы ўсё яшчэ не былі арганізаваны, загадвалася ў найкарацейшыя тэрміны прымаць меры па іх стварэнні, а пры ўмацаванні калгасаў не дапускаць выпадкаў ліквідацыі існуючых кас і растраты фондаў не па прызначэнні [3, арк. 15]. Такія меры дазволілі за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе істотна палепшыць стан сацыяльнага забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў пасляваеннай Заходняй Беларусі.

У цэлым, за першае пяцігоддзе пасля вызвалення ў справе сацыяльнага забеспячэння ўдзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны было зроблена даволі шмат. На пасяджэнні калегіі аддзела сацыяльнага забеспячэння 27 ліпеня 1949 года міністр сацыяльнага забеспячэння БССР Гуцанкова адзначыла, што ў большасці арганізацыі, ведамствы і кіраўнікі, за невялікім выключэннем, сталі адносіцца да патрэб і запытаў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны як да важнай дзяржаўнай і грамадскай справы. Але аб паляпшэнні працы пакуль што гаварыць не прыходзілася нават у такіх абласцях, як Віцебская, Магілёўская і Гомельская, дзе было зроблена значна больш, чым у іншых (заходніх) абласцях. Па-ранейшаму існавала шмат недахопаў. Некаторыя прадстаўнікі ўлады, спасылаючыся на павышэнне матэрыяльнага становішча і дабрабыту працоўных, лічылі, што неабходнасць у праяве такой увагі да інвалідаў, якая існавала падчас вайны ці ў першыя пасляваенныя гады, ужо адпала.

Літаратура

1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч. [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск, 2011. – 728 с.
2. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 307 с.



Репозиторий ВГУ

3. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 53. – Спр. 19.
4. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 11. – Спр. 359.
5. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 4. – Спр. 327.

Репозиторий ВГУ